Вячаслаў КАЛАЦЭЙ,
кандыдат культуралогіі
(Мінск)

# АД УКЛАДАЛЬНІКА

У самым даступным тлумачэнні культура – тое, як мы думаем і як узаемадзейнічаем з наваколлем. У яе межах цалкам месціцца ўсё жыццё асобы. Бескультурных людзей не існуе. Усе далучаны да той ці іншай культуры. Словы «культура» і «традыцыя» часам ужываюць як сінонімы, асабліва, калі ідзе гаворка пра лад жыцця вёскі і пра фальклор. Уласна пад словам «т р а д ы ц ы я» маюць на ўвазе *генетычна стабільны, ураўнаважаны, самадастатковы лад жыцця*. Носьбіты яго паўнаякасна забяспечваюць усе свае патрэбы выключна пераймaннем структуры ладу жыцця старэйшых генерацый. У XXI ст. увага да традыцыі беларусаў расце. Усім, каму не абыякава захаванне беларусаў як народа, цікава э т н а э к а л а г і ч н а с ц ь іх традыцыйнай культуры.

Традыцыйная культура Беларусі – культура яе руральных (вясковых, земляробчых) асяродкаў – даіснавала да XXI стагоддзя. Яна аўтахтонна-міграцыйная па паходжанні. У ёй захаваны адбіткі культур старажытнага палеаеўрапейскага насельніцтва (людзей, якія жылі тут да IV – III тысячагоддзяў да нашай эры), балтаў (рассяліліся на беларускіх тэрыторыях на мяжы III – II тысячагоддзяў да нашай эры), славян (якія рассяліліся на беларускіх тэрыторыях у VI – X стагоддзях нашай эры). Гэта з'яўляецца сведчаннем надзвычайнай трываласці, вялікага этнаэкалагічнага патэнцыялу беларускай традыцыйнай культуры, што не павінна застацца па-за ўвагай педагогаў і выхавацеляў у XXI стагоддзі, стагоддзі т.зв. «антрапалагічнага крызісу». Спалучыць этнаэкалагічны патэнцыял сваёй каранёвай традыцыі з новымі формамі адаптацыйнай стратэгіі, выжывання ў асяродку інфармацыйных грамадстваў – задача складаная, але толькі вырашэнне яе дазволіць народу захавацца ў выглядзе адмысловай этнічнай адзінкі і пазбегнуць шэрагу сацыяльных, экалагічных, дэмаграфічных складанасцей. Асабліва паслядоўна выкладзена думка, што народ не здольны існаваць у непашкоджаным ландшафце без захавання ўласных культурных традыцый, у працах этнолага, гісторыка, географа і культуролага Льва Гумілёва. Згодна з яго высновамі, страта каранёвай культуры – першая прыступка на шляху да этнічнай і, неўзабаве, экалагічнай катастрофы, пасля якой ландшафт (пазбаўлены масавага жыхара – чалавека, сканцэнтраванага напярэдадні катастрофы ў цэнтрах-мегаполісах) прымае свой першапачатковы («цнатлівы») выгляд. Але жыць у ім будуць ужо зусім іншыя людзі. Сам працэс звычайна займае не адно стагоддзе, але яго працягласць не ўплывае на канчатковы вынік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У міленіум мала якія культуры існуюць замкнёна, самі па сабе. Большасць з іх узаемадзейнічаюць і ўзаемапранікаюць. Так, вяскоўцы едуць у гарады і далучаюцца да урбанізаваных культур; лацінаамерыканцы і еўрапейцы імкліва амерыканізуюцца пад уплывам ЗША; жыхары розных рэгіёнаў СССР у свой час актыўна далучаліся да рускамоўнай савецкай культуры. Такія абставіны актыўна мяняюць лад жыцця людзей. Звычайна ва ўмовах іншай культуры яе неафіты па-іншаму здабываюць сабе ежу, жыллё, шлюбных партнёраў, па-іншаму размаўляюць і выхоўваюць дзяцей, чым раней. Неўзабаве ў іх асяродку знікае «матчыная» традыцыя. Аднак часам другая культурная супольнасць не спяшаецца іх прымаць. Неафіты выракаюцца «матчынай» культуры, але застаюцца не далучанымі да новай – чужой. Яны існуюць «на мяжы» розных культур, будучы не далучанымі кардынальна ні да адной з іх, часта ў масавай колькасці, што стварае адмысловыя, т.зв. «крэольскія», культуры. Такія культуры – м а р г і н а л ь н ы я. Існаванне «на мяжы», няўключанасць у агульнае ўсталяванае жыццё навакolля вядуць носьбітаў маргінальных культур да пэўных памежных станаў (ад стрэсаў, самазабойстваў, асацыяльных формаў паводзін да масавых дзеянняў, якія ствараюць нестабільнасць у грамадстве). Дынамічнасць, адрыў ад каранёў – лозунгі сучаснай індустрыяльнай цывілізацыі. Таму маргінальныя культуры інтэнсіўна колькасна павялічваюцца. Такія акалічнасці культурных змен выклікаюць неабходнасць існавання т р а д ы ц ы я н а л і з м у. Сёння ён мае месца на ўзроўнях *філасофіі* (Рэнэ Генон, Юліус Эвола, Аляксандар Дугін); *дзяржаўнай палітыкі* (заканадаўчая падтрымка этнічнай культуры); *грамадскіх паводзін* (фальклорны рух). Краіны, якія ў XX стагоддзі знайшлі «залатую сярэдзіну» паміж традыцыяй і індустрыялізмам, забяспечылі сабе відавочную стабільнасць: эканамічную раўнавагу, сталае міжнароднае рэнамэ, псіхалагічны камфорт і вялікую працягласць жыцця грамадзян. Гэтыя працэсы распачаліся ў сярэдзіне XX стагоддзя (краіны Скандынавіі, Японія, Ізраіль), не спыніліся, працягваюцца напачатку XXI (Польшча, Эстонія, Латвія, Летува). Пытанне пра далейшае існаванне сваёй традыцыі мусяць вырашаць і беларусы.

Як сведчыць рэчаіснасць, да апошніх часоў у «натуральным» (вясковым) асяродку беларуская традыцыя сама сябе транслiравала. Ва ўмовах урбанізацыі і глабалізму яна самастойна трансліраваць сябе не здольна. Становішча з этнаэкалогіяй беларусаў сёння вымагае тэрміновай дзяржаўнай дапамогі спецыялістам-захавальнікам народнай культуры і мастацтва. Сам с э н с дзейнасці спецыялістаў, якія займаюцца *народным мастацтвам*, – *спрыяць яго далейшай трансляцыі* ў часе. Вядома, пажадана з найменшымі якаснымі і эстэтычнымі стратамі. Гэта фактычна з'яўляецца і м э т а й іх дзейнасці, шчыльна пераплеценай з пытаннямі этнаэкалогіі. Непрафесійна і несумленна спрыяць трансляцыі ўзораў мастацтва, якія не маюць анічога агульнага з сапраўднай каранёвай культурай краіны, на сродкі якой дзейнасць па трансляцыі наладжана. Калі кранацца этнафоніі*,

* Этнафонія (ад грэч. εθνος – народ, φωνή – гук) – дэфініцыя, прапанаваная ўкраінскім этнамузыколагам К.В.Квіткам, дзеля вызначэння спецыфікі тэмбравых асаблівасцей гуку, манеры выканання і асаблівасцей фразіроўкі ў народных спевах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

то беларуская песня, якую спяваюць у неадпаведнай манеры, ператвараецца проста ў набор нот і ўзор лубачнага верша [4]. Эстэтычна і з пункту гледжання культурнай антрапалогіі гэта не *з'ява беларускай культуры і традыцыі*, а *з'ява маргінальнай постсавецкай культуры* – падробка, якая не мае каштоўнасці і неадпаведная функцыянальна.

Камунікацыйная с т р а т э г і я захавальнікаў народнай культуры мусіць быць вызначанай пазіцыяй дзяржавы і міжнароднай супольнасці. Дзейнасць, што спрыяе трансляцыі традыцыі, мае прававую падтрымку на розных узроўнях: «Рэкамендацыі пра захаванне фальклору» UNESKO (рэзалюцыя прынята на 32-м пасяджэнні 15 лістапада 1989г.); «Праграма дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры» Рэспублікі Беларусь на 1994 - 1996гг., рэалізацыя пэўных палажэнняў якой працягваецца (гл. даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь на VI Еўрапейскай канферэнцыі IOV 22.09.97г.); дзяржаўныя навукова-тэхнічныя праграмы «Культура» (1997), галіновая праграма «Захаванне і развіццё культуры ў Рэспубліцы Беларусь да 2010г.»; пэўныя раздзелы закона «Аб культуры» Рэспублікі Беларусь і інш. Такі самавіты пласт у нарматыўнай базе, заканадаўстве не павінны заставацца па-за ўвагай адказных асоб – адміністратараў розных узроўняў. Аб'ектыўна, што механізмы, якія сёння распрацоўваюцца, датычацца *ператварэння стратэгіі ў практыку* (і н т э н ц ы й) і відавочна абумоўлены будовай дзяржаўных інстытутаў: апарату кіравання, дзяржаўнай сістэмай адукацыі (школы, ССНУ, ВНУ) і пазашкольнага навучання і выхавання (дашкольныя і пазашкольныя ўстановы) Беларусі. Дзейнасць па этнакультурным выхаванні, якая праводзіцца ў дзяржаўным сектары, мусіць падпадаць пад агульныя правілы і нарматывы, што, калі ўлічыць прыроду фальклору, не здольна не ствараць пэўныя складанасці.

У краіне адвольна складаецца сістэма фестываляў народнага мастацтва, дзе фальклорныя калектывы маюць магчымасць заявіць пра сябе. Гэта міжнародныя фестывалі «Звіняць цымбалы і гармонік» (Паставы, усе жанры), «Сожскі карагод» (Гомель, харэаграфія). Апошнім часам моцна і бліскуча заявілі пра сябе скіраваныя на аўтэнтычныя формы фальклору фэсты «Беларуская полька» (Чачэрск, пераважна харэаграфія) і «Берагіня» (г.п. Акцябрскі – былая Рудабелка, усе жанры). Зараз да арганізацыі фестываляў, акрамя Міністэрства культуры, далучаецца рэгіянальная адміністрацыя, установы і нават прыватныя асобы. Шмат фестываляў球 рознага ўзроўню і якасці, дзе магчымы ўдзел фальклорных калектываў Беларусі, ладзяць ва ўсім свеце. Рэспубліканскія ВНУ рыхтуюць спецыялістаў у галіне народнай культуры. Сярод выпускнікоў факультэта народнай культуры БДПУ імя М.Танка ёсць тыя, хто атрымаў кваліфікацыю «настаўнік сусветнай культуры і кіраўнік фальклорнага гуртка». БДУ культуры і мастацтваў праводзіць падрыхтоўку па наступных спецыялізацыях: кіраўнік народнага харавога калектыву,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкладчык; кіраўнік аркестра і ансамбля народных інструментаў, выкладчык; спецыяліст па фальклоры, выкладчык і інш. З 2004г. факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва БДУ культуры і мастацтваў (загад № 52 ад 01.04.2003 аб стварэнні факультэта падпісаны рэктарам, прафесарам Я.Д.Грыгаровіч, якая заўжды вітае зварот прадстаўнікоў сферы ВНУ да каранёвай культуры) праводзіць набор на спецыялізацыю «этнафоназнаўства», дзе рыхтуюць «фальклярыстаў, якія спяваюць», пазбаўленых штампаў нархораўшчыны. Ва ўмовах наладжанай сістэмы дзейнасці ўстаноў адукацыі, культуры, пазашкольнага навучання і выхавання асноўная, першасная прыступка азнаямлення дзяцей і моладзі з фальклорам – дзіцячы (юнацкі) фальклорны ансамбль. З яго пачынаюць знаёміцца з этнічнай культурай гараджане, а сёння і вясковыя жыхары. Спецыфіка працы фальклорнага ансамбля ва ўмовах дзяржсістэмы адукацыі і выхавання распрацавана яшчэ ў часы былога СССР. Такія тыпавыя дакументы, як вучэбная праграма «Фальклорный ансамбль»[3] і шматлікія больш сучасныя распрацоўкі[2], *абавязкова* прадугледжваюць азнаямленне навучэнцаў з р э г і я н а л ь н а й спецыфікай фальклорных праяў. Гэта першая ўмова э т н а к у л ь т у р н а г а в ы х а в а н н я *(набыцця асобай грамадска карысных ведаў, уменняў і навыкаў сродкамі народнага мастацтва)*. Фактычна ў Беларусі ў межах арганізаванага працэсу навучання і выхавання яно акрэслілася з 1970-х гг., калі з'явіліся дзіцячыя фальклорныя калектывы. Адным з першых быў ансамбль «Зорачка» (кіраўнік Маргарыта Іванова) Рэспубліканскага Палаца піянераў і школьнікаў. Зараз дзіцячыя фальклорныя калектывы існуюць ва ўсіх раёнах Рэспублікі Беларусь. Некаторыя з іх сапраўды з'яўляюцца фальклорна-этнаграфічнымі, дзе навучанне вядзецца на аўтэнтычных узорах часам шляхам пераймання ад носьбітаў традыцыі.

С і т у а ц ы я з ф а л ь к л о р а м у Беларусі ўжо даўно хвалюе навукоўцаў-тэарэтыкаў і практыкаў адукацыі, культуры і мастацтва. Іх непакой расце па меры таго, як узбуйняюцца працэсы «вымывання» народнага мастацтва з побыту народа і абмежавання яго існавання выключна сцэнічнымі пляцоўкамі і музейнымі фондамі. Сёння фальклор, акрамя сродку выхавання беларусаў, сродку этнічнаафарбаванай духоўнай практыкі, формы камунікацыі, стаўся камерцыйным прадуктам, элементам музычнай, выдавецкай, турыстычнай, відовішчнай індустрыі. У арбіту яго жыццядзейнасці ў розных формах і акалічнасцях трапляюць рок-музыкі і поп-выканаўцы, удзельнікі модных клубаў гістарычнай рэканструкцыі, аматары нетрадыцыйнай медыцыны, прадпрымальнікі і бізнесмены, замежныя навукоўцы і нефармалы, удзельнікі культурных і рэлігійных рухаў і інш. Сітуацыя, як заўсёды, досыць стандартная для ўсёй Усходняй Еўропы, і нашыя суседзі – летувісы, латышы, украінцы, палякі, расіяне - пакутліва шукаюць з яе выйсце. Часам з большым імпэтам і самаадданасцю, чым беларусы. Іх досвед можа быць цікавы і карысны для вырашэння нашых праблем, таму запрашаць іх да дыялога, да рады не толькі пажадана, але і неабходна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дадзенае выданне заклікана паспрыяць камунікацыі паміж зацікаўленымі бакамі прафесіяналаў, аналізу і абмеркаванню сітуацыі з фальклорам у краіне, прынамсі ў галіне этнакультурнага выхавання музычнымі сродкамі дзяцей і моладзі Беларусі. Выданне наладжана ў рэчышчы выканання задання па інструментальнай этнафоніі галіновай праграмы «Захаванне і развіццё культуры ў Рэспубліцы Беларусь да 2010г.». Менавіта ў межах задання № 6 гэтай праграмы двойчы на год з 2006 г. па 2009-ты будуць ладзіцца фальклорныя школы для : а)дзяцей і моладзі краіны, якія трапілі ў арбіту этнакультурнага выхавання; б)зацікаўленых у камунікацыі спецыялістаў па фальклоры. Мэта «Штудый» – аналіз і асвятленне акалічнасцей і сацыякультурнага фону этнакультурнага выхавання. Рэдакцыйная калегія выдання «Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы», у якую ўваходзяць пераважна прадстаўнікі прафесарска-выкладчыцкага складу ўстановы адукацыі «БДУ культуры і мастацтваў», бачыць яго ў якасці рэспубліканскага навукова-папулярнага выдання па праблемах прыкладной культуралогіі, этнапедагогікі, гісторыі мастацтваў.

Матэрыялы, змешчаныя ў выданні, сугучныя праблемнаму полю, узнятаму веснавой фальклорнай школай, якая адбылася з 23 па 26 красавіка 2006 года ў Мінску. Слова 'штудыі' – сінонім слова 'працы', аднакарэннае са словам 'штудзіраваць' – «настойліва, старанна вывучаць» [2], яно мае ўжытак у культуралагічнай думцы і выдавецкай практыцы сучаснай Беларусі [1]. Паколькі фанетычная дыялектная дакладнасць у выданні па фальклоры – норма, назвы краін падаюцца ў фанетыцы, набліжанай да нацыянальных моў: Летува, Малдова, Башкордастон. У кожным выпадку, калі ўжываюцца дыялектызмы, гэта спецыяльна пазначаецца. З улікам спецыфікі дадзенага выдання, аўтары пакідаюць за сабою права ўжываць выразы і тэрміналогію, генетычна ўласцівую беларускім гаворкам: «даць рады» замест «справіцца»; «капа» замест «круглы стол» і інш.

## Літаратура


1. Санько, С. Штудыі з кагнітыўнай і кантрастыўнай культуралогіі / С.Санько. – Мінск : Бел. гуманітар.-адукац. культур. цэнтр, 1998. – 189 с.
2. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : больш за 65 000 слоў / пад рэд. М.Р.Судніка, М.Е.Крыўко. – Мінск : БелЭн, 1996. – С. 764.
3. Фольклорный ансамбль // Музыка : программа для внешк. учреждений и общеобраз. школ. – М. : Просвещение, 1986. – С. 356 – 366.
4. Хай, М.И. Этнофония, этнафонія, етнофония / М.И.Хай // Восточнославянский фольклор : словарь науч. и нар. терминологии / редкол. : К.П.Кабашников (отв. ред.) и др. – Мінск, 1993. – С. 464.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ